Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 68

# АБ АБ'ЯЎЛЕННІ 2007 ГОДА ГОДАМ ДЗІЦЯЦІ

У мэтах забеспячэння дзяржаўнай і грамадскай падтрымкі і абароны дзяцінства, стварэння ўмоў для станаўлення і гарманічнага развіцця асобы дзіцяці:

1. Аб'явіць у Рэспубліцы Беларусь 2007 год Годам дзіцяці.

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіць склад арганізацыйнага камітэта і рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенню ў 2007 годзе Года дзіцяці і прыняць іншыя меры, неабходныя для выканання гэтага Указа.

3. Аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму зацвердзіць рэгіянальныя планы мерапрыемстваў па правядзенню ў 2007 годзе Года дзіцяці.

4. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.**

*1 лютага 2007 г., г. Мінск.*

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 ЛЮТАГА 2007 г. АЎТОРАК

№ 24 (25889)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Для падтрымкі дзяцей і моладзі

**У Год дзіцяці Міністэрства адукацыі Беларусі правядзе серыю мерапрыемстваў, накіраваных на падтрымку дзяцей, падлеткаў і моладзі. Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА намеснік міністра адукацыі Таццяна Кавалёва.**

«Усе намаганні дарослых у 2007 годзе будуць накіраваны на тое, каб жыццё кожнага дзіцяці было радасным і паспяховым, стабільным і шчаслівым, — адзначыла намеснік міністра. — Нараджэнне і выхаванне дзяцей, выкананне бацькоўскіх функцый у нашай краіне разглядаецца як важнейшая сацыяльна значная з'ява і маральная каштоўнасць».

На сённяшні дзень у Беларусі налічваецца больш як 2 млн. 27 тыс. дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. З іх 32 тыс. — сіроты. «У большай ступені гэта, на жаль, сацыяльнае сіроцтва», — адзначыла Таццяна Кавалёва. Пры гэтым яна падкрэсліла, што ў Беларусі створана новая мадэль арганізацыі міжведамаснай работы па ахове і абароне дзяцей, якія знаходзяцца ў складанай жыццёвай сітуацыі.



Фота Мікалая ПЯТРОВА, БЕЛТА.

Уручэнне прэмій «Лепшы джазмен года» адбылося ў заключны дзень форуму «Мінскі джаз-2007». Як адзначыў на цырымоніі мастацкі кіраўнік Нацыянальнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Беларусі, народны артыст рэспублікі прафесар Міхаіл Фінберг, беларускаму джазу хутка споўніцца 70 гадоў, аднак ушанаванне лепшых айчынных джазавых музыкантаў у рэспубліцы праходзіць упершыню. Узнагароду з рук Расціслава Янкоўскага атрымаў гітарыст Сяргей Анціпшын. Трамбаністу Андрэю Глушко прэмію ўручыў Уладзімір Гасцюхін. Адзначаны быў і 12-гадовы саксафаніст Раман Гаварко **(на здымку)**. Лаўрэатам прэміі пасмяротна стаў легенда беларускага джаза Анатоль Гілевіч. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Мінскі гарвыканкам і нацыянальны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Беларусі.

Рынак працы

# СЯРЭДНІ ЎЗРОВЕНЬ — ЯШЧЭ НЕ ВАКАНСІЯ

**Пэўны рост працоўных рэсурсаў і зваротаў па дапамогу ў працаўладкаванні не прывялі да ўскладнення сітуацыі з занятасцю. Больш таго, даводзіцца канстатаваць, што за мінулы год колькасць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных у краіне зноў зменшылася — прыкладна на 15,9 тыс. чалавек. Разам з тым нельга не адзначыць: на айчынным рынку працы сёлета застаецца шэраг ужо традыцыйна «балючых кропак». І перш-наперш гаворка ідзе аб праблемах з занятасцю жанчын, моладзі, а таксама цяжкасцях з пошукам «лішняга месца» ў некаторых малых гарадах і пасёлках.**

### МУЖЧЫНЫ. З ПАВЫШАНЫМ ПОПЫТАМ

Паводле папярэдніх ацэнак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, летась колькасць грамадзян, занятых у айчыннай эканоміцы, павялічылася прыкладна на 25 тыс. чалавек. Пры гэтым найбольшае «папаўненне» работнікаў адзначана ў энергетыцы, чорнай металургіі, харчовай прамысловасці і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, будаўніцтве, гандлі і грамадскім харчаванні, жыллёва-камунальнай гаспадарцы.

Не менш адметным фактам варта назваць скарачэнне больш чым на чвэрць маштабаў вымушанай няпоўнай занятасці на вытворчасці. А таксама павелічэнне (зноў-такі на чвэрць) попыту на працоўную сілу. У прыватнасці, у пачатку гэтага года ў службах занятасці было зарэгістравана 52 тыс. беспрацоўных. І адначасова тут мелі звесткі аб наяўнасці 44,8 тыс. вакансій.

— Найбольшым попытам у наймальнікаў карыстаюцца рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў (да прыкладу, муляры, страхары, мантажнікі, тынкоўшчыкі), а таксама інжынеры-будаўнікі, — распавядае начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва міністэрства Мікалай Коханаў. — Шмат вакансій заяўляе прамысловасць (токары, фрэзероўшчыкі, электраманцёры, электрамантажнікі, слесары-інструментальшчыкі, слесары-сантэхнікі, наладчыкі абсталявання), застаюцца запатрабаванымі вадзіцелі аўтамабіляў, трактарысты, машыністы бульдозераў і экскаватараў. Нарэшце, высокай папулярнасцю карыстаюцца ўрачы, праграмісты, прарабы, інжынеры-канструктары і прадстаўнікі шэрагу іншых спецыяльнасцяў.

Адначасова вось ужо на працягу некалькіх гадоў запар практычна ва ўсіх рэгіёнах маюць цяжкасці з працаўладкаваннем педагогі, таваразнаўцы, юрысты і эканамісты. І асабліва невялікі попыт тут на работнікаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Зрэшты, калі гаворка ідзе аб кан'юнктуры, нельга не адзначыць яшчэ адну «старую» праблему — арыентацыю айчыннага рынку на выкарыстанне мужчынскай працы. Сапраўды, за мінулы год доля беспрацоўных жанчын зменшылася з 68,9 да 65,8 працэнта. Тым не менш гэта — паказчык высокі. І зменшыць яго за хуткі час цяжка. Асабліва калі ўзяць пад увагу той факт, што да 70 працэнтаў ад агульнай па краіне колькасці вакансій разлічана менавіта на «моцную палову». Тым не менш, мяркуе Мікалай Коханаў, шмат у чым змякчыць сітуацыю з беспрацоўем жанчын можна дзякуючы арганізацыі іх перанавучання і павышэння кваліфікацыі. Так, не сакрэт: вынікам стане павышэнне канкурэнтаздольнасці. І перш-наперш гэта датычыцца маці, якія выходзяць з водпуску па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

### МАЛЫ ГОРАД — ДАДАТКОВЫ ШАНЦ?

Новы год — іншыя рэаліі. Сёлета за кошт скарачэння насельніцтва ў працаздольным узросце колькасць працоўных рэсурсаў Беларусі зменшыцца на 4,5 тыс. чалавек. Аднак, адзначае Мікалай Коханаў, на сітуацыі з беспрацоўем сам па сабе гэты факт адаб'ецца нязначна. Як мяркуюць у міністэрстве, на працягу года па дапамогу ў дзяржаўную службу занятасці можа звярнуцца каля 225 тыс. чалавек. Таму чакаецца, што сёлета 2,4 тыс. беспрацоўных атрымаюць фінансавую дапамогу для адкрыцця ўласнай справы, 24,4 тысячы — пройдуць навучанне ці перанавучанне, і, апроч таго, у краіне плануецца стварыць больш за 140 тысяч новых працоўных месцаў. Такім чынам, агульны ўзровень беспрацоўя ў цэлым па Беларусі павінен захавацца ў цяперашніх межах. І ўсё ж ці не найбольш вострае пытанне — становішча ў канкрэтных рэгіёнах.

— Па выніках мінулага года колькасць беспрацоўных зменшылася ў 38 з 42 малых гарадоў і рэгіёнаў, дзе адзначаецца традыцыйна высокае напружанне на рынку працы. Плюс да таго, па сутнасці ўдалося стабілізаваць становішча ў астатніх чатырох «цяжкіх» рэгіёнах, — зазначае Мікалай Коханаў. — Аднак казаць, што зараз тут ужо няма ніякіх пытанняў, нельга. Сёлета толькі ў дзяржаўную праграму занятасці павінны ўвайсці 29 «праблемных кропак». Да прыкладу, на Брэстчыне гэта Ганцавічы, Мікашэвічы, Бяроза, Белаазёрск і Іванава, на Віцебшчыне — Паставы, Новалукомль, Копысь, Арэхаўск і Барань, на Гомельшчыне — Добруш, Жыткавічы, Рагачоў, Васілевічы і Акцябрскі, на Гродзеншчыне — Масты, Скідаль, Бярозаўка і Свіслач, на Міншчыне — Урэчча, Гарадзея і Плешчаніцы, на Магілёўшчыне — Краснаполле, Хоцімск, Глуск, Бялынічы, Слаўгарад, Кіраўск і Глуша.

На працягу мінулага года ў «праблемных» гарадах удалося стварыць 8440 новых працоўных месцаў. Сёлета ж, як плануецца, гэты паказчык атрымаецца большым. Праўда, лічаць у міністэрстве, зняць усе пытанні па асобных рэгіёнах будзе магчыма толькі паступова — да 2010 года. Прынамсі, вызначана, што менавіта тады ўзровень беспрацоўя ў «напружаных» раёнах павінен выйсці на сярэднеабласныя лічбы.

### КАМП'ЮТАР УЖО НЕ ПРАФЕСІЯ

Тэма для асобнай гаворкі — моладзь. Яе доля ў агульнай структуры беспрацоўных летась зноў-такі зменшылася з 45,5 да 44,8 працэнта. Разам з тым прагноз на 2007 год падаецца даволі красамоўным: сёлета не змогуць распачаць прафесійнае навучанне каля 25 тыс. выпускнікоў школ. І гэта праблема — адна з галоўных.

— У сітуацыі, калі пад уплывам дэмаграфічных працэсаў у Беларусі будзе змяншацца колькасць працаздольнага насельніцтва ў працаздольным узросце, ёсць толькі адзін шлях — «уцягванне» ў легальную дзейнасць так званых «эканамічна неактыўных» грамадзян, — перакананы Мікалай Коханаў. — І да таго ж вельмі важна зрабіць усё, каб колькасць «эканамічна неактыўных» не папоўнілася за кошт моладзі, якая закончыла школу, але па тых ці іншых прычынах не здолела распачаць прафесійнае навучанне. І, адпаведна, рызыкуе ператварыцца ў «хранічных» беспрацоўных.

З улікам гэтага, мяркуюць у міністэрстве, сёння ні ў якім разе нельга зніжаць аб'ёмы прафесійнай падрыхтоўкі, і галоўным чынам — па рабочых спецыяльнасцях. А калі ўсё ж малады чалавек застаўся па-за ВНУ, тэхнікумам ці прафтэхвучылішчам, ён па-ранейшаму зможа атрымаць прафесію непасрэдна праз службы занятасці насельніцтва. Прычым тут першачарговае накіраванне на навучанне будзе давацца якраз беспрацоўным ва ўзросце да 18 гадоў, інакш кажучы, — тым самым выпускнікам школ. Што да саміх прапаноў, то, як правіла, яны арыентуюцца на найбольш папулярныя на рынку вакансіі. Скажам, службы занятасці маюць намер абмежаваць колькасць накіраванняў на навучанне аператарамі ПЭВМ, бухгалтарамі, а ў асобных рэгіёнах — гандлярамі. І ў той жа час выпускнікам будуць больш актыўна раіць асвоіць спецыяльнасці, звязаныя з будаўніцтвам і машынабудаваннем.

Апроч таго, у бліжэйшы час плануецца заканадаўча ўрэгуляваць сітуацыю з вучнёўствам. Гэта павінна падштурхнуць прадпрыемствы і арганізацыі прымаць да сябе і навучаць непасрэдна «на месцы» маладых людзей, якія ўпершыню шукаюць працу. І, дарэчы, заўважае Мікалай Коханаў, у гэтым выпадку выдаткі, звязаныя з навучаннем, могуць быць кампенсаваныя органамі службы занятасці.

### ШЫЛЬДА ЗМЯНІЛАСЯ. СУТНАСЦЬ — УСЁ ТАЯ Ж

Між тым, яшчэ адна асаблівасць новага года — «знікненне» традыцыйных раённых цэнтраў занятасці насельніцтва. Што змянілася ў выніку? І, уласна кажучы, куды зараз звяртацца ўсім тым, каму неабходна дапамога ў працаўладкаванні?

— Сёння кожны чалавек, якому патрабуецца працоўнае месца, можа звярнуцца ў аб'яднаную структуру — раённае ці гарадское ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, — зазначае Мікалай Коханаў. — Прычым падкрэслю адразу, што, нягледзячы на пераўтварэнні і пэўнае скарачэнне персаналу, у нас захаваліся самі прынцыпы работы і патрабаванні да рэгістрацыі беспрацоўных. І такім чынам, ёсць усе падставы меркаваць: новая служба будзе працаваць па-ранейшаму без збояў.

**Сяргей ГРЫБ.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### «МІНІМАЛЬШЧЫКАМ» — НОВЫ ПАМЕР

**З 1 лютага праіндэксаваны сацыяльныя і мінімальныя працоўныя пенсіі, а таксама надбаўкі і павышэнні да іх.**

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Валянціна Каралёва, індэксацыя сацыяльных, мінімальных працоўных пенсій, а таксама надбавак і павышэнняў да іх праведзена ў сувязі з павелічэннем бюджэту пражытачнага мінімуму. У прыватнасці, новы памер мінімальнай пенсіі па ўзросту зараз складае 42 625 рублёў. Дарэчы, нагадваю, што ў міністэрстве, летась падобны пераразлік рабіўся тройчы — у лютым, маі і жніўні.

**Сяргей ГРЫБ.**

### ПРЫМАРОЗІЦЬ: ЎНАЧЫ ДА МІНУС 22

**Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фёдатава, сёння тэрыторыя Беларусі трапіць у тылавую частку антыцыклона, які рухаецца ў бок еўрапейскай часткі Расіі, таму істотна пахаладае.**

Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад 1 да 7 градусаў марозу, а ў паўднёвых раёнах — да плюс 2, а ў Віцебскай вобласці — мінус 5—10 градусаў. Пройдзе снег. На дарогах суцэльная галалёдзіца.

У сераду халоднае арктычнае паветра са Скандынавіі зробіць маразы яшчэ больш моцнымі. Так, уначы на сераду тэмпература зніціца да мінус 10—16 градусаў, а ў паўночных раёнах нават да 18—22 марозу. Удзень — 7—13 марозу. Толькі на поўдні краіны 7 лютага на працягу сутак — 0—6 марозу. Згодна з папярэднімі прагнозамі, марознае надвор'е захаваецца да пятніцы. У выхадныя вільготны і цёплы вецер з боку Атлантыкі дасягне Беларусі і маразы істотна аслабеюць. Часам будзе ісці мокры снег. Тэмпература ўначы — 2—8 градусаў марозу, удзень — ад мінус 3 да плюс 2. Трэба заўважыць, што небяспечная галалёдзіца працягваецца на дарогах на працягу ўсяго тыдня.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ЛЕНІН НА ВЫВАЗ

**Ашмянскія мытнікі затрымалі партыю рарытэтных прадметаў.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, у пункце пропуску «Гудагай» увагу мытнікаў прыцягнуў «стары знаёмы», грамадзянін І. Яго неаднаразова за апошнія тры гады затрымлівалі пры спробе незаконнага вывазу з Беларусі прадметаў мастацтва. На гэты раз кантрабандыст прыхаваў у дарожнай сумцы праваслаўны абраз з зацёртым інвентарным нумарам, фарфоравыя статуэткі і дэкаратыўную цукарніцу, а таксама два металічныя барэльефы Леніна. Усе гэтыя рэчы, як адзначылі ў ДМК, маюць калекцыйную каштоўнасць.

**Мікола ДЗЯБЕЛА.**

### У АБАРАЧЭННІ — «НАПАЛЕОН ОРДА. 200 ГАДОЎ»

**З сённяшняга дня Нацыянальны банк краіны выпускае ў абарачэнне памятныя манеты «Напалеон Орда. 200 гадоў», паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка Міхаіл Жураковіч.**



Сярэбраная манета мае намінал 20 рублёў (пробу сплаву 925, масу 33,63 г), медна-нікелевая — намінал 1 рубель. Дваццацірублёвая манета адзначана якасцю «пруф» і тыражом 5000 штук, а медна-нікелевая — «пруф-лайк» і мае тыраж 7000 штук.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ПАЦЯРПЕЛЫЯ...

**У Расонах вечарам з дому мясцовага жыхара ў бальніцу з рэзанымі ранамі цела былі змешчаны двое братоў з Полацка — вучань 11-га класа і 23-гадовы рабочы аднаго з таварыстваў.**

Як высветлілася падчас правядзення аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў, гэтыя двое паблізу вёскі Азярцы каля шашы гадзін вечара падчас бойкі нажом забілі жыхара Полацка, які падвозіў іх на аўтамабілі «Рэно». Машына і цела няшчаснага з мноствам колата-рэжучых ран знойдзены праваахоўнікамі. У бальніцы, дзе знаходзяцца браты, выстаўлены пост міліцыі.

**Аляксей ЦІТОЎ.**

### «ФОЛЬКСВАГЕН» ВЫРУЛІЎ НА СУСТРЭЧНУЮ...

**Гэта прывяло да таго, што тры чалавекі загінулі, а яшчэ тры змешчаны ў бальніцу.**

Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося на дарозе паблізу Светлагорска каля паловы дванаццатай дня. Непрацуючая жанчына, якая кіравала аўтамабілем «Фольксваген», выехала на паласу сустрэчнага руху і сутыкнулася з «Аўдзі», за рулём якой знаходзіўся жыхар сталіцы. У выніку аварыі пасажыры «Фольксвагена» — пенсіянер і непрацуючы загінулі на месцы здарэння, а яшчэ аднаго мужчыну не змаглі выратаваць урачы: ён памёр у бальніцы. Да таго ж двое пасажыраў «Фольксвагена» і сама вадзіцель гэтай машыны атрымалі траўмы і змешчаны ў бальніцу.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### РАБАЎНІКОЎ ЗАТРЫМАЛІ Ў МІКРААЎТОБУСЕ

**Па дапамогу ў Лёзненскі РАУС звярнуўся грамадзянін Літвы, вадзіцель адной з фірмаў, на якога паблізу вёскі Заольша напалі невядомыя.**

Мужчына спыніў аўтамабіль «Сканія», каб адпачыць. А каля паловы пятай раніцы нехта пастукаў у дзверы кабіны. Калі ж мужчына адчыніў іх, то ў машыну заскочылі двое невядомых і адабралі ў сваёй ахвяры грошы і сотавы тэлефон. Зніклі злачынцы з месца здарэння на мікрааўтобусе «Сузукі». У гэтым мікрааўтобусе іх і затрымалі ў Лёзне супрацоўнікі раённага аддзела Дэпартамента аховы праз чатыры з паловай гадзіны пасля здарэння. Як высветлілася, разбойнічалі на дарозе двое непрацуючых жыхароў Оршы, адзін з якіх быў раней судзімы за крадзеж.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ДЗІЦЯ ЎПАЛА З 11-ГА ПАВЕРХА ДОМА

**У нядзелю вечарам у 9-ю бальніцу Мінска быў дастаўлены пяцігадовы хлопчык з траўмамі, якія ён атрымаў пры падзенні з вялікай вышыні.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, здарылася бяда на вуліцы Касманаўтаў у доме № 41. У гэтым будынку з 11-га паверха ўніз і звалілася дзіця. Паводле папярэдніх даных, стан пацярпелага ацэньваецца як цяжкі, але стабільны. Праверкай гэтага здарэння займаюцца супрацоўнікі Маскоўскага РУУС сталіцы.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Прамая лінія

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ

# ВЫБАР БЕРАЖЛІВАГА — ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНЫ ТАВАР

**Сёння пытанням энергаэфектыўнасці ў рэспубліцы надаецца асаблівая ўвага: пасля сумнавядомых падзей з заключэннем кантрактаў на пастаўку энергарэсурсаў у Беларусь з Расіі мы вымушаны працаваць у новых умовах. Прыходзіць і разуменне таго, што пры большай эканоміі энергіі давядзецца менш плаціць за энергарэсурсы, кошт якіх павялічыўся. Раней, калі нафты хапала, а газ быў танным, пра эканомію энергіі асабліва не задумваліся. Зараз энергаэфектыўнасць становіцца рэальным прыярытэтам развіцця Беларусі. А работа па энергазберажэнню ў нашай краіне складваецца з вялікай колькасці напрамкаў эканоміі — усяго іх каля 150. Так, сёлета ў краіне магчыма знізіць энергаёмістасць ВУП больш чым на 6—7 працэнтаў, упэўнены ў Дэпартаменце па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарта. Стаіць задача павялічыць выкарыстанне мясцовых відаў паліва да 25 працэнтаў у агульным балансе, але, паводле меркавання спецыялістаў, да 2012 года цалкам рэальна выйсці і на лічбу 30 працэнтаў. Зразумела, шмат у гэтым пытанні залежыць і ад насельніцтва. Адна з задач — навучыць беларусаў рацыянальна карыстацца энергарэсурсамі і максімальна атрымліваць аддачу ад таго цяпла, якое паступае ў кватэры. Як стаць больш беражлівымі і на чым можна зэканоміць, на што трэба звяртаць увагу пры куплі бытавой тэхнікі? — пра гэта і шмат іншае падчас «прамой лініі» Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё ішла гутарка начальніка ўпраўлення ацэнкі адпаведнасці і ліцэнзавання Дзяржкамітэта па стандартызацыі Неаліны ПРОХАРЧЫК і начальніка ўпраўлення тэхнічнага нармірвання і стандартызацыі Дзяржстандарта Ірыны НІКАЛАЕВАЙ з радыёжурналістам Максімам УГЛЯНІЦАЙ і карэспандэнтам «Звязды».**

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

ПРЫКЛАД ЭТЫКЕТКІ ЭНЕРГЕТЫЧНАЙ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ХАЛАДЗІЛЬНЫХ ПРЫБОРАЎ





# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПАВОДКА Ў ІНДАНЕЗІІ

**Каля 75 працэнтаў плошчы Джакарты ў выніку моцных сезонных праліўных дажджоў і, як вынік, разліву 13 рэчак, апынуліся пад вадой.**

Па даных на вечар панядзелка, 30 чалавек загінулі і каля 350 тысяч вымушаны пакінуць свае дамы. Улады заяўляюць, што робяць усё магчымае, але яны фізічна не ў стане справіцца з самай моцнай паводкай за ўсю гісторыю горада, у якім пражывае 12 мільёнаў чалавек. Многія жыхары сталіцы перабіраюцца на верхнія паверхі і дах у чаканні спаду вады.

### БОМБА ПА ПОШЦЕ

**У адзін з лонданскіх офісаў прыйшоў канверт, у якім аказалася бомба.**

Яна ўзарвалася, калі жанчына адкрывала паштоўку. Інцыдэнт адбыўся на Вікторыя-стрыт, у будынку, які знаходзіцца ў 180 метрах ад Скотланд-Ярда. Пацярпелая накіравана з лёгкімі раненнямі ў бальніцу, жыццю яе нічога не пагражае.

### «ТРЭНІРУЙСЯ НА... КОШКАХ!»

**На сайце рэспубліканскай выбарчай камісіі Эстоніі пачалося галасаванне за кандыдатаў у... лясны парламент.**

У выбарах прымаюць удзел тры партыі: парнакапытныя (кабан, лось і алень), драпежнікі (воўк, рысь, мядзведзь і ліса) і грызуны (пацук, мыш і вавёрка). Такім чынам ЦВК вырашыў праверыць сістэму электроннага галасавання перад выбарамі ў «чалавечы» парламент, якія адбудуцца ў канцы лютага.

### АМЕРЫКАНЕЦ З'ЕЎ 182 КРЫЛЬЦЫ

**23-гадовы Джо Чэснат з Сан-Хасэ выйграў Кубак Крыла — спаборніцтвы па абжорству, якія праходзяць штогод у Філадэльфіі (ЗША).**

За фіксаваны час ён з'еў больш за ўсіх — 182 — курыныя крыльцы. «Я люблю есці. Сёння я глытаў крыльцы цалкам, грыз косці,» — адзначыў Чэснат. Пераможцу была ўручана карона, упрыгожаная гумавымі курамі.

### БРЫТАНЦЫ — РЭКАРДСМЕНЫ

**Кожны брытанец штогод знішчае 17,6 кілаграма туалетнай паперы, што ў два з паловай раза больш за сярэднееўрапейскія паказчыкі.**

Спажыванне яе ў Вялікабрытаніі складае 110 рулонаў на чалавека ў год. Гэта ў 25 разоў больш, чым на Украіне, жыхары якой абмежаваліся ўсяго чатырма з паловай рулонамі. У сярэднім у краінах Заходняй Еўропы спажыванне гэтага прадукту складае 12,4 кілаграма. Сярод новых членаў ЕС больш за ўсіх расходуюць жыхары Балтыі — 3,9 кілаграма ў год, а вось эканомныя немцы затрачваюць у тры разы менш — 1,3 кілаграма. Паводле даных даследаванняў, спажыванне туалетнай паперы ў Заходняй Еўропе вырасла за апошняе дзесяцігоддзе на 40 працэнтаў. Прычынай гэтаму, мяркуюць спецыялісты, сталі крэатыўныя дызайнерскія рашэнні па афармленню тавару.



## УП «Минский городской центр недвижимости»

проводит открытый аукцион по предоставлению юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям во временное пользование торговых площадей в торговом центре «Купаловский»

| №№ лота | Номера торговых мест | Площадь торгового места, кв.м | Начальная цена кв. м, евро | Срок аренды, месяцев | Размер задатка, базовых величин |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 106 | 4,0 | 37,5 | 12 | 10 |
| 2. | 72 | 6,0 | 63,0 | 12 | 10 |
| 3. | 70 | 5,0 | 63,0 | 12 | 10 |
| 4. | 24 | 6,5 | 37,5 | 12 | 10 |

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на р/с 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень необходимых документов и порядок подачи определен условиями проведения аукциона. Договор аренды с победителем заключается в течение 3 рабочих дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится 16 февраля 2007 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие в аукционе принимаются по 15 февраля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб.6. Контактные телефоны: 227-40-22, 227-48-36. **Наш сайт в Интернете www.mgcn.by**

## КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит аукционные торги по продаже:

- части двухэтажного кирпичного здания с двумя входами ОАО «Копыльский РКБО» (185,6 кв.м), расположенного в центре г. Копыля по ул. Партизанская д.5. Пл. зем. участка 0,0736 га. Нач. цена 137 500 000 бел.руб. с НДС;
- здания столовой (кафе) в п. Энергетиков Дзержинского р-на (общ.пл. 580,6 кв.м). Пл. зем. участка — 0,0866 га. Нач. цена 387 660 000 бел. руб. с НДС;
- производственной базы (здания конторы и гаража общ. пл. 151,2 кв.м, ограждение территории, благоустройство) в д. Октябрьская Витебского района. Пл. зем. участка– 0,1727 га. Нач. цена — 35 500 000 бел. руб. с НДС;
- производственной базы (гараж площадью 266 кв.м, склад — 309 кв.м, служебное помещение – 35 кв.м, ж/б ограждение протяженностью 234 п.м.) в п. Сосновый Осиповичского района. Пл. зем. участка– 0,3537 га. Нач. цена 46 683 000 бел. руб. с НДС;

**КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН (8017) 2246134. САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT.BY**



ISSN 1990-763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.02.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 141,00 |
| 1 еўра | 2 774,09 |
| 1 латвійскі лат | 3 983,63 |
| 1 літоўскі літ | 803,05 |
| 1 чэшская крона | 98,46 |
| 1 польскі злоты | 715,06 |
| 1 расійскі рубель | 80,70 |
| 1 украінская грыўня | 423,10 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 26,5288 |
| 10 UAH | 52,3695 |
| 1000 BYR | 12,3318 |
| EUR | 34,3601 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 5.02.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2220 / 2320 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

белагропромбанк
традиции будущего

ЗАВЕРЯЮ
Начальник управления
по ценным бумагам Главного
управления Министерства финансов
Республики Беларусь по г. Минску
В.Н.Омельянович
«5» февраля 2007 г.

УТВЕРЖДЕНО
Протокол
Наблюдательного совета
ОАО «Белагропромбанк»
«30» января 2007 г., № 2

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

*об открытой продаже облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» девятого выпуска, обеспеченных обязательствами по возврату основной суммы долга и уплате процентов по предоставленным кредитам на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости*

**1. Наименование эмитента:**

открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк»).

адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк» (ААТ «Белаграпрамбанк»).

**2. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего.**

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее Банк) преобразовано из Белорусского республиканского банка Агропромбанк СССР учредительной конференцией 11 февраля 1991 г. и зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 3 сентября 1991 г., регистрационный № 20. Устав Открытого акционерного общества «Белагропромбанк» утвержден общим собранием акционеров 11 февраля 1991 г. (протокол № 1).

ОАО «Белагропромбанк» в своей деятельности руководствуется Конституцией Республики Беларусь, Банковским кодексом Республики Беларусь, другими нормативными правовыми актами, действующими на территории Республики Беларусь, а также Уставом Банка.

Банк является универсальным, входит в единую банковскую систему Республики Беларусь и соблюдает государственную денежно-кредитную политику. С 1996 года Банк является агентом Правительства Республики Беларусь по обслуживанию государственных программ посредством выдачи кредитов на финансирование долгосрочных инвестиционных проектов и строительство жилья.

ОАО «Белагропромбанк» осуществляет комплексное обслуживание предприятий, объединений и организаций агропромышленного комплекса республики, сельскохозяйственных арендаторов, крестьянских хозяйств, их объединений, союзов и ассоциаций, предприятий, объединений, учреждений других отраслей экономики, независимо от форм собственности, совместных предприятий, созданных на территории Республики Беларусь с участием иностранных инвестиций, профсоюзных и других общественных организаций, а также граждан, в соответствии с действующим законодательством.

**3. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**

Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
Телефон: (017) 228 52 06, факс (017) 228 53 01
Электронный адрес E-mail: info@belapb.by

**4. Основные виды и срок деятельности эмитента.**

Основной целью деятельности Банка является извлечение прибыли и ее распределение между акционерами Банка.

Банк осуществляет банковскую деятельность с целью развития производственных и товарно-денежных отношений в агропромышленном комплексе и экономике Республики Беларусь, а также содействия интеграционным процессам в сфере межгосударственных финансовых отношений.

Для достижения целей, определенных Уставом, ОАО «Белагропромбанк» на основании полученного специального разрешения (лицензии) и в соответствии с правилами и в порядке, установленными Национальным банком Республики Беларусь, имеет право осуществлять следующие банковские операции:

- привлечение денежных средств физических и юридических лиц во вклады (депозиты);
- размещение привлеченных денежных средств от своего имени и за свой счет на условиях возвратности, платности и срочности;
- открытие и ведение банковских счетов физических и юридических лиц;
- открытие и ведение счетов в драгоценных металлах;
